**Субаткевіч Іван Вікенцьевіч**

**Карлаўшчызна: Іван Субаткевіч**

Жыхарка Варнян Тэрэса Стакун узгадвае пачутае ад бацькі: «Калі мне прыйшла павестка на вайну, у хаце дзверы з заслонаў зляцелі – мама надта плакала!»

*– Бабуля ўспрыняла гэта як нядобры знак: сын не вернецца, **– перадае бацькавы ўспаміны дачка ветэрана**. – Іх у сям'і шэсць братоў. Тата з 1908 года, і адзін – з 1916-га – толькі іх абодвух прызвалі на вайну, хаця яны не самыя старэйшыя.*




Нарадзіўся Іван Вікенцьевіч у в. Попішкі, пазней сям'я пераехала ў Карлаўшчызну – адтуль і прызвалі Субаткевіча на фронт.

*– Бацька казаў, што страшна вельмі было там… А яшчэ ж і трапіў у палон ва Усходняй Прусіі. (Дарэчы, яго брат таксама прайшоў праз палон.) Не ведаю, колькі ён там прабыў, **– расказвае жанчына**.*

Калі Іван Вікенцьевіч вярнуўся ў родную Карлаўшчызну, родныя не ведаюць.

Але гэта было хутка пасля заканчэння вайны, бо ў 1948 годзе былы салдат ужо стварыў сям’ю.




Дачка франтавіка ўзгадвае, што ён быў выдатным працаўніком, цудоўным бацькам і мужам:

*– За ім жылі як за каменнай сцяной. Нас з сястрычкай заўсёды песціў – кожнаму б такога тату мець!* **– прыгадвае Тэрэса Стакун**. *– Мне быў годзік, калі памерла маці. Тата ажаніўся ў другі раз. Дык вось, мама (мачаха. – Заўв. аўт.) ніводнага дня не пайшла без таты на ферму, дзе працавала, – ён заўсёды хацеў даць ёй палёгку, бо шкадаваў. Па гаспадарцы маме ва ўсім дапамагаў: і печы прапаліць, і кароў падаіць, і свінням даць… Хаця ж і свайго занятку ў яго хапала: ён быў будаўніком калгаса «Звязда», потым паляводам, жывёлаводам. Памёр дастаткова рана: у 1972 годзе – і мама больш ні дня не выйшла на работу.*

*– Да слова, хоць тату давялося пабыць і ў палоне, і на прымусовых работах,*

*медалі ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны ён меў (захоўваў іх у скрыначцы, укручанай у льняную тканіну). Мы, дзеці, любілі іх прымяраць, – дзеліцца дачка франтавіка. – І вельмі бацька радаваўся, калі на Дзень Перамогі атрымліваў віншавальныя паштоўкі ад ваенкамата – ён надта цаніў такую ўвагу ад дзяржавы!*

Текст: Рита Дремо
Фото: Рита Дремо
*https://www.ostrovets.by/news/novosti/news57927.html*